активность, профессионализм в выполнении разработанных проектов плац-концерта являются залогом красочного, яркого и выразительного исполнения, способного привлечь внимание зрителей к военной музыкальной культуре и строевой подготовке в целом.

**Список литературы**

1. Концепция непрерывного воспитания детей и учащейся молодежи: утв. постановлением Министерства образования Республики Беларусь №82 от 15 июля 2015 г. — Режим доступа: https://etalonline.by/document/?regnum=u215e2080. — Дата доступа: 17.04.2023.

2. Программа патриотического воспитания населения Республики Беларусь на 2022–2025 годы : утв. постановлением Совета Министров Республики Беларусь №773 от 29.12.2021 (ред. от 28.03.2022) [Электронный ресурс]. — Режим доступа: https://pravo.by/document/?guid=12551&p0=C22100773&p1=1. — Дата доступа: 17.04.2023.

3. Военно-патриотическое воспитание учащихся: пособие для педагогических работников учреждений образования, реализующих образовательные программы общего среднего образования с белорусским и русским языками обучения / В.Г. Стуканов [и др.]. — Минск: Национальный институт образования, 2023. — 256 с.

*Дата поступления в редакцию: 13.09.2023*

# ДЭМАНСТРАЦЫЙНЫ МАТЭРЫЯЛ ДА ЎРОКАЎ І ДАДАТКОВЫХ ЗАНЯТКАЎ ПА БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ НА І СТУПЕНІ АГУЛЬНАЙ СЯРЭДНЯЙ АДУКАЦЫІ ПА ТЭМЕ “КВЕТКІ”: АСАБЛІВАСЦІ ВЫКАРЫСТАННЯ

*Трацэўская Алена Віктараўна*

Для большасці малодшых школьнікаў нашай краіны першай мовай, якую яны чуюць ад бацькоў, з’яўляецца руская мова. Сапраўднае беларускамоўнае асяроддзе для іх звычайна адсутнічае. Узнікла сітуацыя, калі родная мова не з’яўляецца мовай дзіцячага мыслення. Навучэнцы рускамоўных школ сутыкаюцца са значнымі цяжкасцямі пры вывучэнні беларускай мовы і літаратуры.

Навучэнцы І ступені агульнай сярэдняй адукацыі, якія засвойваюць беларускую мову як другую, не маюць пастаяннага беларускамоўнага асяроддзя. Пазбегнуць ці пераадолець інтэрферэнцыю ў такой сітуацыі можна толькі шляхам усведамлення асаблівасцей рускай і беларускай моў. Пры гэтым трэба звяртаць увагу дзяцей не толькі на факты адрознення ў арфаграфічных сістэмах абедзвюх моў, але і на факты супадзення. Асэнсаванне гэтых фактаў дае магчымасць ажыццяўляць станоўчы перанос ведаў і навыкаў па рускай арфаграфіі на беларускую, пераадолець або прадухіліць ужыванне адметных арфаграфічных асаблівасцей адной мовы ў другой.

Праблема засваення беларускай мовы, а таксама адносінаў да яе існуе. Як паказваюць даследванні, дзеці мала ведаюць вершаў на памяць, маюць бедны лексічны запас, складаюць сказы са шматлікімі памылкамі [1; 3; 4; 5]. Сцвярджаць гэта непрыемна, але для большасці вучняў авалоданне беларускай мовай можна параўноўваць з вывучэннем замежнай. Нашыя дзеці жывуць у рускамоўным грамадстве і не адчуваюць запатрабаванасці ва ўжыванні беларускай мовы ў штодзённай рэальнасці. Паўстае пытанне: як прызвычаіцца да мовы?

Настаўнік пачатковых класаў заўседы працуе над гэтай праблемай і вырашае, як знайсці правільны шлях, а галоўнае зацікавіць малодшых школьнікаў роднай мовай. Другая праблема — гэта пераадоленне псіхалагічнага бар’ера ва ўспрыманні беларускамоўных вучэбных дысцыплін. Сучасныя настаўнікі шукаюць прыемы, метады і формы правядзення вучэбных заняткаў, каб былі больш эмацыянальна прываблівымі для малодшых школьнікаў. Педагогі пачатковых класаў Дзяржаўнай ўстановы адукацыі ”Крулеўшчынская сярэдняя школа Докшыцкага раёна імя І.П. Ціткова“ вырашылі падабраць і выкарыстоўваць сучасныя падыходы да выкладання вучэбнага прадмета “Беларуская мова”.

Каб зацікавіць вучняў, зрабіць іх не пасіўнымі гледачамі на ўроку, а актыўнымі ўдзельнікамі навучальнага працэсу, настаўнікі імкнуцца, каб урок роднай мовы стаў адкрыццём новага, незабыўнага, закрануў сэрцы вучняў, абудзіў іх думкі.

Настаўнікі нашай установы адукацыі прапануюць вучням факультатыўныя заняткі па беларускай мове, мэта якіх — актыўнае засваенне актуальнай лексікі, пашырэнне слоўніка навучэнцаў для ажыццяўлення камунікацыі на беларускай мове і фарміравання нацыянальнага светапогляду.

Вучням пачатковых класаў цяжка засвойваць матэрыял, выказваць свае думкі, будаваць звязнае выказванне на беларускай мове. Гэта звязана з невялікім слоўнікавым запасам, з няўменнем выкарыстоўваць тую ці іншую лексічную адзінку ў маўленні [2]. Таму настаўнік на уроках не толькі ўзбагачае слоўнікавы запас вучняў але і сістэматычна праводзіць работу па актывізацыі слоўніка, г.зн. стварае вучэбныя сітуацыі па выкарыстанні новых слоў у працэсе маўлення на

розных этапах урока.

Практыка падцвярджае, што вучні намнога лепш запамінаюць і выкарыстоўваюць новыя словы, калі настаўнік арганізуе работу на аснове тэматычнага прынцыпу, у адпаведнасці з якім новыя словы вывучаюцца групамі — адзенне, мэбля, посуд, ежа, дрэвы, кветкі, жывёлы і г. д. У якасці асноўных прыёмаў тлумачэння лексічнага значэння слоў могуць быць выкарыстаны дэманстрацыя малюнкаў.

Дзецям малодшага школьнага ўзросту ўласцівыя асаблівыя здольнасці да засваення мовы. Яны лёгка і з цікаўнасцю запамінаюць новыя словы і моўныя звароты, авалодваюць рознымі лінгвістычнымі канструкцыямі. Асабліва, калі прапанаваць ім новую лексіку ў прываблівай форме.

Адзін з варыянтаў такой працы — засваенне лексікі тэматычнымі блокамі. Настаўнікамі нашай установы адукацыі распрацаваны дыдактычны матэрыял па



Малюнак 1

блоках, які можна выкарыстоўваць як на факультатыўных занятках, так і на ўроках па беларускай літаратуры, рускай літаратуры, прадмета “Чалавек і свет” і іншых.

Наш матэрыял можна выкарыстоўваць як дэманстрацыйны на вучэбных занятках, а таксама на роз-



Малюнак 2

ных этапах на факультатыўных занятках для індывідуальнай, калектыўнай, групавой работы, работы ў парах.

**Гульня ”Адгадай“.**

Мэта: узбагачэнне і актывізацыя слоўнікавага запасу вучняў па прапанаванай тэме (руская мова і беларуская мова).

Адзін вучань выбірае любы малюнак, а другі выбірае для яго назву на рускай/беларускай мове (калі работа арганізавана ў парах).

Можна прапанаваць работу ў групах. Па чарзе вучні выбіраюць малюнак, астатнія павінны агдадаць назву (можна спачатку на рускай мове, а потым на беларускай ці наадварот). (Малюнак 1).

**Гульня ”Перакладчыкі“.**

Мэты: развіццё цікавасціу вучняў да вывучэння роднай мовы;

фарміраванне у навучэнцаў актыўнага слоўнікавага запасу;

замацоўванне умення суадносіць назвы прадметаў на рускай і беларускай мовах.

Настаўнік ці вучань выбірае малюнак. Адзін вучань выбірае назву прадмета на беларускай мове, другі – на рускай мове. (Малюнак 2).

**Гульня ”Знайдзі па назве“.**

Мэта: замацоўванне ўмення суадносіць назвы прадметаў з малюнкам.

Адзін вучань выбірае назву прадмета (на рускай/беларускай мове), а другі шукае адпаведны малюнак. (Малюнак 3).

Самае разумнае — прыслухацца да парадаў маленькіх беларусаў, пазбаўленых шчасця бездакорна-


Малюнак 3

га валодання роднай мовай. Наўрад ці яны здолеюць самастойна справіцца з псіхалагічным бар'ерам непрыняцця беларускай мовы. І мы, настаўнікі, павінны дапамагчы ім, бо ад гэтага залежыць наша «заўтра».

Ад маладога чалавека, які ўступае ў жыццё, сёння патрабуецца ўменне працаваць у групе і ў калектыве, адстойваць сваю думку, згладжваць канфлікты, адчуваць адказнасць за работу, быць мабільным, камунікабельным, гібкім у розных сітуацыях. Але вельмі важна разумець, што авалодаць названымі кампетэнцыямі можна толькі шляхам дзейнасці вучняў. Каб навучыцца ўзаемадзейнічаць, трэба ўзаемадзейнічаць.

Такім чынам, выкарыстанне дыдактычных гульняў з'яўляецца добрым сродкам для павышэння матывацыі вучняў да навучання.

На прыкладзе адной тэмы мы паказала асноўны алгарытм работы з дэманстрацыйным матэрыялам. У нашай педагагічнай скарбонцы ёсць таксама распрацаваныя тэмы "Дзікія жывелы", "У доме", "У кватэры", "Садавіна і гародніна", "Птушкі", "Адзеннне і абутак".

### Спіс літаратуры

1. Жуковіч, М.В. Лічбавыя адукацыйныя рэсурсы і інфармацыйнакамунікатыўныя тэхналогіі ў сучасным вучэбным працэсе / М.В. Жуковіч // Беларуская мова і літаратура. – 2014. – №2. – С. 3–13 ; №5. – С. 35–45.

2. Ляшчынская, В.А. Методыка выкладання беларускай мовы / В.А. Ляшчынская, З.У. Шведава. – Мінск: РІВШ, 2007. – 252 с.

3. Падгайскі, Л. П. Развіццё мовы вучняў пачатковых класаў / Л. П. Падгайскі, Я.М. Івашуціч. – Мінск : Нар. асвета, 1979. – 102 с.

4. Протчанка, В.У. Актуальныя праблемы тэорыі і практыкі навучання беларускай мове / В.У. Протчанка. – Мінск: НІА, 2001. – 212 с.

5. Яленскі, М.Г. Асобасны падыход у методыцы навучання беларускай мове : тэарэтыка-эксперыментальнае даследаванне / М.Г. Яленскі. – Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 1997. – 171 с.

Дадатак

QR-код дэманстрацыйнага матэрыяла па тэме "Кветкі"

*Дата поступления в редакцию: 02.10.2023*